**УДК 930.2(47+57):94(476)“13/17”**

# САВЕЦКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГАРАДСКОГА САМАКІРАВАННЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIV – XVIII СТАГОДДЗЯ

***канд. гіст. навук С.П. СТРЭНКОЎСКІ***
***(Мінскі дзяржаўны інстытут развіцця адукацыі)***

*Аналізуюцца погляды савецкіх гісторыкаў міжваеннага і пасляваеннага перыядаў, у тым ліку дарэвалюцыйных, якія працягвалі даследаванні ў савецкі час, расійскіх і літоўскіх даследчыкаў на праблемы гарадскога самакіравання. Адзначана пераемнасць у даследаванні гэтай тэматыкі, працы гісторыкаў дарэвалюцыйнага перыяду паклалі пачатак вывучэнню дадзенага пытання ў савецкі час. Ацэнка развіцця гарадоў у гэты час давалася з марксісцкіх пазіцый, што прывяло да недастатковай увагі да пытанняў самакіравання. Пры гэтым заслугай савецкіх гісторыкаў з’яўляецца адмаўленне адмоўнай ацэнкі магдэбургскага права ў гісторыі гарадоў Вялікага княства Літоўскага.*

Гістарычная навука ў Беларусі атрымала новыя магчымасці для свайго развіцця пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Станаўленне БССР абудзіла цікавасць да больш грунтоўных пошукаў у галіне гістарычнага мінулага беларускага народа. Новыя метадалагічныя падыходы, звязаныя з усталяваннем улады бальшавікоў, выклікалі неабходнасць пераасэнсавання ранейшых даследаванняў. Вынікі апошніх знайшлі сваё адлюстраванне ў працах дарэвалюцыйных гісторыкаў М.К. Любаўскага і У.І. Пічэты, якія былі апублікаваныя пасля рэвалюцыі.

Так, М.К. Любаўскі ў кнізе “Асноўныя моманты гісторыі Беларусі” з папраўкай на новыя рэаліі жыцця ізноў паўтарыў свае думкі пра тое, што магдэбургскае права “адмежавала і адасобіла ад народнай масы гарадское насельніцтва, замкнула яго ў сябелюбівых пачуццях і імкненнях і адхіліла ад шырокай будоўлі народнага жыцця”. Гісторык адзначыў, што нямецкае права было дадзена буйным гарадскім цэнтрам, што некаторы час у Падняпроўскіх і Задзвінскіх валасцях існавала мяшчанска-сялянскае самакіраванне, якое захоўвала “рускую даўніну”. Як і ў дарэвалюцыйных працах, М.К. Любаўскі падкрэсліў паланізацыю мяшчанства буйных гарадоў, што прыводзіла да змены іх “рускага” характара на польскі [1, с. 18].

У сваіх кнігах “Гісторыя Літоўскай дзяржавы да Люблінскай уніі” і “Гісторыя беларускага народа” У.І. Пічэта прыводзіць паўторна свае погляды пра большыя праявы гарадскога жыцця ў заходніх раёнах ВКЛ, пра жаданне павелічэння гандлю і прамысловасці як падстаў, якімі кіраваўся ўрад, надаючы гарадам магдэбургскае права [2, с. 32, 146]. Асаблівы ўздым надання магдэбургскага права ў XVI стагоддзі гісторык звязаў з “выключным гандлёва-прамысловым уздымам” [2, с. 146]. Ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі ў якасці такой прычыны ён прыводзіў іх пераход да “сельскагаспадарчай культуры” і ўцягванне іх у арбіту “заходнееўрапейскіх гандлёвых адносін” [2, с. 49]. Пры гэтым у “Гісторыі Літоўскай дзяржавы” У.І. Пічэта чамусьці не прыводзіў звесткі пра атрыманне магдэбургскага права Берасцем у 1390 годзе. Вучоны адзначаў, што магдэбургскае права прывяло да адасаблення гарадоў ад валасцей, што да канца XVI – пачатку XVII стагоддзя яно ахапіла ўсе “найбольш відныя гарадскія цэнтры”, вылучыўшы іх у асобныя адміністрацыйна-судовыя адзінкі [2, с. 49]. Распаўсюджанне нямецкага права адносіў ва ўсходніх абласцях ВКЛ да другой паловы XVI стагоддзя, да гэтага ж стагоддзя – у прыватных гарадах [2, с. 29, 32]. На чале гарадоў У.І. Пічэта змясціў прызначаемых гаспадарамі войтаў, якія ў XVI стагоддзі сталі выбарнымі, пажыццёвых лаўнікаў, што ажыццяўлялі суд па крымінальных справах, бурмістраў і радцаў, якія ажыццяўлялі бягучае кіраванне, займаліся паліцыяй, судом, гарадскімі маёмасцямі, надзорам за гандлем, мерамі і маральным станам гараджан [2, с. 32]. Як тыповыя У.І. Пічэта прывёў звесткі па самакіраванню Полацка, Мінска, Віцебска, Магілёва. Як тыповыя рысы права на самакіраванне адзначыў дакладнае вызначэнне павіннасцяў, права на таргі і кірмашы, права склада [2, с. 30, 32]. Адзначаў адзінкавы выпадак надання магдэбургскага права нехрысціянскаму насельніцтву – караімам у Троках (называў іх яўрэямі) [2, с. 63]. Набыццё магдэбургскага права прызнаваў працэсам аб’ектыўным. Падкрэсліваў, што яно давала самакіраванню “знешнюю форму, ніколькі не забіваючы мясцовага права і мясцовых звычаяў”, пры гэтым формы самакіравання ў розных гарадах былі рознымі, садзейнічала росквіту гарадоў [2, с. 146]. Ён адзначаў неабходнасць штогадовай справаздачы рады перад грамадой, магчымасць апеляцыі ад яе прысудаў да войта, а потым да вялікага князя [2, с. 147]. Лічыў, што пасля выкупа гарадамі войтаўскіх пасад рада стала органам, які валодаў першынством, сама сябе папаўняла, выбірала таксама лаўнікаў, па прычыне чаго абшчыны стваралі асобыя заканадаўчыя органы з 40 чалавек [2, с. 147]. Падрывалі гарадское самакіраванне, на думку У.І. Пічэты, умяшальніцтва каралеўскіхураднікаў і буйных землеўласнікаў, выданне шляхтай законаў вузкасаслоўнага характара, а таксама “падзенне замежнага транзітнага гандлю і змена гандлёвых шляхоў”, “прывілеі шляхты” [2, с. 146 – 147].

Тэма гарадоў працягваецца на старонках даследаванняў гісторыкаў паслярэвалюцыйнага часу. У 20 – 30 гады XX стагоддзя было апублікавана некалькі артыкулаў, гаворка ў якіх ішла пра гарады Беларусі ў XVI – XVII стагоддзях.

Абагульняючы характар мелі працы В.Д. Дружчыца, у якіх ён разглядае формы і функцыі войтаўскай улады і магістратаў у беларускіх гарадах. У працы “Войты і іх улада” В.Д. Дружчыц падкрэсліваў вельмі слабы ўзровень даследавання гэтых пытанняў [3]. Прычыну ўтварэння асобных органаў улады ў гарадах бачыў у выдзяленні іх ў асобныя адзінкі. Ён бачыў войтаў прадстаўнікамі вялікага князя (па прычыне прыналежнасці гарадоў гаспадару), аднак адзначаў пры гэтым, што даваліся гэтыя пасады і тым людзям, за якіх прасілі мяшчане. Звяртаў увагу В.Д. Дружчыц і на розніцу ў пасадах і паўнамоцтвах войтаў у розных гарадах, знаходзіў у прызначэнні войтаў з шляхецкага асяроддзя прычыну прыніжанага становішча гараджан. Лічыў, што неяснасць кампетэнцыі войтаў і магістратаў выклікала барацьбу паміж імі, пэўны канчатак якой паклаў Віленскі вількер 1620 года, які выкарыстоўваўся і іншымі гарадамі ВКЛ.

У працы “Магістрат у беларускіх местах” гісторык даследаваў узнікненне і арганізацыю гарадскога ўрада на прыкладзе Вільні, Берасця, Полацка, Мінска, Магілёва, Віцебска і юрыдыкі ў іх [4]. Падкрэсліваючы нязначную колькасць крыніц па гісторыі магістратаў, адзначаў, што прывілеі на магдэбургскае права самі па сабе даюць няшмат звестак па іх арганізацыі, што гарадскі ўрад у іх адзначаўся толькі агульнымі рысамі. Па прычыне апошняга гарады самі вымушаны былі ствараць свае ўрады. Гэты працэс займаў дастаткова вялікі прамежак часу: да канца XVI і нават другой паловы XVII стагоддзя ў асобных гарадах. Працэс утварэння гарадскога самакіравання, па меркаванні В.Д. Дружчыца, суправаджаўся значнай барацьбой паміж асобнымі сацыяльнымі групамі, вынікам якой стаў актыўны ўдзел гараджан у выбарах службоўцаў горада. На склад магістрата значны ўплыў аказвала дамагдэбургскае развіццё гарадоў. Пры гэтым В.Д. Дружчыц наяўнасць паспалітых сцвярджаў асаблівасцю Магілёва, прычым адзінкавай на Беларусі. Да склада магістрата гісторык адносіў бурмістраў, радцаў і лаўнікаў, хоць прыводзіў звескі пра аднясенне да яго войтаў, а таксама пра неабходнасць неўключэння ў яго лаўнікаў. Ён адзначаў, што ў некаторых гарадах рада і лава па сутнасці не раздзяляліся, утвараючы адзіны ўрад, што існавалі рочныя змены ўрада з рознай яго колькасцю ў розных гарадах. Таксама падкрэсліваў, што гарады пасля надання магдэбургскага права “не былі цэлымі адзінкамі ў адміністрацыйных адносінах” і што яно не распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю горада. Пад дзеяннем магдэбургскага права заставалася толькі тая частка горада, якая не ўваходзіла ў прыватныя юрыдыкі.

Дружчыц В.Д. з’яўляецца таксама аўтарам прац пра Вільню ў першай палове XVI стагоддзя і Менск у канцы XV – пачатку XVI стагоддзяў [5; 6]. Пры гэтым, гаворачы пра Мінск, заўважаў, што прывілеі не гаварылі аб тым, якімі выданнямі магдэбургскага права трэба карыстацца [6, с. 6]. Адзначаў таксама, што парадак выбараў радцаў вызначыць нельга, што ў рочных зменах бурмістраў, радцаў і лаўнікаў замянялі тыя ж службоўцы старой рады [6, с. 11]. У наданні магдэбургскага права Вільні і яго пацверджаннях у далейшым бачыў уплыў міжусобнай барацьбы ў ВКЛ [5, с. 5]. Не пагаджаўся з Ю. Крашэўскім наконт выбарнасці войтаў у Вільні ад пачатку іх існавання [5, с. 13]. Падрабязна разглядзеў склад віленскага самакіравання [5, с. 13 – 14]. Ва ўсіх артыкулах В.Д. Дружчыц зазначаў уплыў канкрэтных умоў Беларусі XV – XVII стагоддзяў на арганізацыю гарадскога самакіравання, лічыў іх падставай для арганізацыі і дзейнасці гарадской улады. Усе артыкулы багатыя фактычным матэрыялам. Да тагож В.Д. Дружчыц у сваёй працы “Беларускія месты ў гістарычнай літаратуры” робіць гістарыяграфічны агляд пытання [7].

Бурдзейка А.В. даследаваў сацыяльна-эканамічнае жыццё Навагрудка ў XVI стагоддзі [8]. Пры гэтым навуковец раглядзеў і асобныя пытанні самакіравання: змест магдэбургскага прывілея 1511 года, пацвярджальных прывілеяў, абавязкі службоўцаў, правы і павіннасці мяшчан, адносіны горада і замка. Вызначаў як уласна прадстаўнікоў мяшчан бурмістраў і радцаў [8, с. 7]. Лічыў, што магдэбургскія прывілеі мелі вялікую вартасць для гараджан, таму што “даваліся не дарма”, а за пэўны грашовы ўзнос [8, с. 9 – 10]. Прычынамі надання нямецкага права лічыў просьбу саміх мяшчан, клопат уладаў пра гарадскі скарб, імкненне павялічыць эканамічную ролю горада і наогул забяспечыць яго развіццё [8, с. 11].

Гісторыі Берасця ў XVI стагоддзі прысвечаны артыкул Т.І. Забэлы [9]. У ім разгледжаны падаткі і павіннасці мяшчан Берасця, іх прывілеі, склад і прыбыткі месцкага ўрада і горада ў цэлым, палажэнне прыватнаўласніцкага насельніцтва горада і яго ўзаемаадносіны з магдэбургскім. Носьбітамі прывілеяў Т.І. Забэла лічыў купецка-гандлёвую групу, аб’яднаную ў гільдыю, і рамеснікаў, аб’яднаных у цэхі [9, с. 21]. Адзначаў недакладнае вызначэнне прывілеямі складу гарадскіх уладаў, на падставе ўскосных звестак прыводзіў парадак выбараў і колькасць службоўцаў горада [9, с. 21 – 23].

Сцяпанаў Ц. разглядаў гісторыю Магілёва [10]. Ён сцвярджаў, што прычынай надання яму магдэбургскага права было эканамічнае развіццё горада, барацьба гараджан за свае правы і незалежнасць, а не хадайніцтва старосты.

Даўгяла Зм., які ўнёс вялікі ўклад у публікацыю крыніц па самакіраванню Мінска, Магілёва, у артыкуле “Брацтва прасалаў” паказаў адносіны паміж гэтым брацтвам і гарадскімі ўладамі Магілёва, аднак знаходзіў у брацтвах і цэхах элементы капіталістычных адносін [11].

Вывучэнне гісторыі гарадоў у пасляваенныя гады значна актывізавалася. Беларускімі гісторыкамі-урбаністамі ў 60 – 70 гады XX стагоддзя апублікаваны шэраг даследаванняў развіцця беларускіх гарадоў феадальнай эпохі.

У манаграфіі З.Ю. Капыскага “Эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі ў XVI – першай палове XVII стагоддзя” пэўнае месца адводзіцца гарадскому самакіраванню [12]. Гісторык пераканаўча робіць вывад аб тым, што ў гарадах Беларусі адбывалася своеасаблівая ўніфікацыя юрыдычных нормаў, што аб’ядноўвала магдэбургскае права і агульнадзяржаўнае заканадаўства. Грунтоўны аналіз развіцця юрыдык дазваляе яму зрабіць вывад аб небяспецы іх для гарадскіх абшчын і аб барацьбе гарадскіх уладаў за распаўсюджанне сваёй юрысдыкцыі на ўсё насельніцтва гарадоў.

Праблема сацыяльна-палітычнага становішча гарадоў знайшла сваё адлюстраванне ў працах: З.Ю. Капыскага “Сацыяльна-палітычнае развіццё гарадоў Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.”, “Магдэбургскае права ў гарадах Беларусі”, “З гісторыі грамадска-палітычнага жыцця гарадоў Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.”, А.П. Грыцкевіча “Сацыяльная барацьба гараджан Беларусі ў XVI – XVIII стст.”; “Кіраванне прыватнаўладальніцкіх гарадоў Беларусі без магдэбургскага права (XVI – XVIII стст.)”, “Прыватнаўладальніцкія гарады Беларусі ў XVI – XVIII стст.” [13 – 18]. Указаныя даследаванні дазволілі абвергнуць няслушныя ўяўленні па пытаннях магдэбургскага права, якія існавалі ў буржуазнай гістарыяграфіі. Аўтарамі даказана, што вялікае значэнне ў падараванні гарадам правоў прадстаўлялі жалаваныя граматы вялікіх князёў. Яны ўсталёўвалі юрыдычнае становішча гараджан, якое, аднак, не стала на Беларусі самастойнай палітычнай сілай. Навукоўцы З.Ю. Капыскі і А.П. Грыцкевіч канстатавалі сур’ёзную ролю магдэбургскага права ў эканамічным і сацыяльна-палітычным жыцці гарадоў. У адпаведнасці з ім склалася сістэма гарадскога самакіравання. Гісторыкі пераканаўча паказалі, што магдэбургскі лад не ствараў перашкод развіццю гарадоў і што ўвядзенне яго абумоўлена аб’ектыўнымі прычынамі, а не капрызамі вярхоўнай улады. Выяўлена таксама існаванне характэрнага спалучэння магдэбургскіх і старажытна рускіх норм права.

Капыскі З.Ю. лічыў, што магдэбургскае права было вылучана на парадак дня новымі гістарычнымі ўмовамі. Вечавы лад не адпавядаў ужо інтарэсам гандлёва-рамесніцкага насельніцтва. Даследчык паказаў склад магістратаў у розных гарадах, дзейнасць органаў самакіравання. Па меркаванні З.Ю. Капыскага, магдэбургскае права не магло забяспечваць прывілеяванае становішча нямецкага і польскага купецтва, бо яны складалі выключэнне сярод гараджан; што гарадская палітыка вялікіх князёў базіравалася на пераўтварэнні эканамічнай дзейнасці гарадоў у пастаянную крыніцу даходаў скарба. Самакіраванне, якое ўсталёўвалася ў гарадах, было сродкам абароны і выканання правоў і прывілеяў, якія былі дадзены гораду. Гісторык на падставе аналізу прывілеяў гарадам лічыў, што ў граматах не агаворвалася кола асоб, якія маглі быць выбранымі ў гарадское самакіраванне. Таксама сцвярджаў, што магдэбургскі ўзор не ўтрымліваў дэмакратычных прынцыпаў арганізацыі гарадскога самакіравання [14].

Як лічыў А.П. Грыцкевіч, самакіраванне прыватнаўласніцкіх гарадоў уводзілася на аснове формаў магдэбургскага права з рознымі мадыфікацыямі і запазычаннямі. Уводзілася яно паступова, бо першапачаткова было няпоўным. Першаснай фігурай у ім быў войт. З цягам часу памяншалася роля адміністрацыі ўладальніка і адпаведна пашыралася роля магістратаў, хоць яны і працягвалі знаходзіцца пад уладальніцкім кантролем. Залежнасць гараджан ад уладальніка ў такіх гарадах не была прыгоннай. Паўнамоцтвы магістрата пашыраліся не толькі на мяшчан, але і на іншае насельніцтва горада. Прычым А.П. Грыцкевіч сцвярджае, што магістраты прыватнаўласніцкіх гарадоў карысталіся большымі правамі, чым у каралеўскіх, знаходзячыся пры гэтым пад жорсткім кантролем уладальніка; што роля магістратаў захоўвалася да канца XVIII стагоддзя [16, с. 199 – 201].

Карпачоў А.М., які разглядаў магдэбургскае права ў беларускіх гарадах XVII – XVIII стагоддзяў, гаворыў аб тым, што яно ўмацоўвала саслоўныя правы мяшчан, абмяжоўвала ўладу над імі каралеўскіх службоўцаў, дапамагала ў барацьбе са свавольствамі феадалаў, задавальняла агульныя інтарэсы гараджан, а ў найбольшай ступені гарадскіх вярхоў, якія мелі алігархічную па сутнасці ўладу. На яго думку, у другой палове XVIII стагоддзя прававое становішча мяшчан пагаршалася, пастанова сейма 1776 года аб ліквідацыі магдэбургскага права ў большасці гарадоў ВКЛ датычылася толькі ўласна магдэбургскіх судоў, а элементы самакіравання засталіся [19]. Таксама А.М. Карпачоў разглядаў пытанні існавання феадальных юрыдык у гарадах Беларусі ў параўнанні з польскімі гарадамі, у тым ліку ажыццяўленне ў іх самакіравання і суда [20].

Мялешка В.І., які даследаваў гісторыю Магілёва ў XVI – першай палове XVII стагоддзя, сцвярджаў, што самакіраванне садзейнічала росту гарадоў, што граматы на самакіраванне даваліся гарадам Беларусі ў перыяд іх роста, што магдэбургскае права “не было механічным перанясеннем нямецкага права ў яго чыстым выглядзе на тэрыторыю Беларусі”, што беларускія гарады мелі свае асаблівасці, якія ўплывалі на змены асобных палажэнняў магдэбургскага права [21, с. 176 – 177]. Мялешка В.І. таксама лічыў, што ў ВКЛ гарадскія суды неаднойчы падзяляліся на войтаўска-лаўніцкія і бурмістроўска-радзецкія; што такі падзел звужаў правы і функцыі рады, бо яе судзебная кампетэнцыя не распаўсюджвалася на ўсіх гараджан (хоць згодна магдэбургскаму праву рада і не павінна была займацца ўсімі судовымі пытаннямі); што падзел судоў вёў да пашырэння правоў феадалаў і павелічэння даходаў войтаў [21, с. 185 – 187]; што судовыя рашэнні магілёўскім магістратам выносіліся на аснове перакладаў Ландрэхта і Вейхбільда Граіцкім і Шчэрбічам, “цэзарскага” і “земскага” права [21, с. 191]. Няслушным здаецца выснова В.І. Мялешкі пра тое, што суды ў Магілёве знаходзіліся поўнасцю ў веданні рады [21, с. 190], бо ва ўсіх судовых пратаколах адлюстроўваецца прысутнасць на судовых паседжаннях войтаў ці ландвойтаў і лаўнікаў.

Даследаваннем самакіравання гарадоў плённа займаўся гісторык права Я.А. Юхо – разглядаў прававое становішча насельніцтва Беларусі феадальнага перыяду. На яго думку, у XV – XVI стагоддзях на Беларусі склалася новая галіна права – феадальнае гарадское права, адной з асноўных крыніц якога былі прывілеі [22 – 23]. Агульныя нормы гэтага права вызначалі структуру органаў кіравання і суда, павіннасці і некаторыя ільготы мяшчан [22, с. 23, 24, 30, 31]. Па меркаванні Я.А. Юхо, ужо ў XV стагоддзі аформілася саслоўе мяшчан і ішоў шпаркі працэс яго прававога афармлення. Уладныя паўнамоцтвы ў адносінах да мяшчан атрымоўвалі войт, ландвойт, бурмістры, радцы і лаўнікі. Кнігі П. Шчэрбіча і Б. Граіцкага даследчык лічыць дапаможнымі крыніцамі ў тых выпадках, калі іх палажэнні не супярэчылі нормам мясцовага права і правасумленню мясцовыхураднікаў. Запазычанні з нямецкага права па адміністрацыйных і крымінальна-працэсуальных пытаннях былі дапасаваныя да мясцовых умоў [23, с. 26 – 31].

Расійскі гісторык А.Ю. Дварнічэнка лічыць, што ўвядзенне магдэбургскага права было абумоўлена не толькі зменай сацыяльнай структуры насельніцтва і ўзроўню эканамічнай дзейнасці гарадоў, але і развіццём феадальнага землеўладання і ростам польскага ўплыву [24].

Шэраг даследаванняў па гарадскому самакіраванню ў ВКЛ правялі савецкія літоўскія гісторыкі.

Так, магдэбургскае права ў літоўскіх гарадах ВКЛ даследавалася Ю.М. Юргінісам, які лічыў, што да часоў заканчэння панавання Уладзіслава IV вярхоўная ўлада ВКЛ абараняла мяшчан ад свавольства шляхты і мясцовай адміністрацыі, імкнулася палепшыць эканамічнае становішча гарадоў і павялічыць даходы казны. Але пасля таго, як убачылі, што гэтыя надзеі не спраўдзіліся, урад спыняе клопаты пра гарады. Юрыдыкі, на думку Ю.М. Юргініса, падзялялі гарады на асобныя судова-адміністрацыйныя адзінкі, якія разбуралі гаспадарку горада; супярэчнасці наконт зямельных правоў мяшчан, якія існавалі ў статутовым і магдэбургскім праве, прыводзілі да канфліктаў паміж магістратамі і вялікакняжацкімі ўраднікамі. Па словах Ю.М. Юргініса, урад ВКЛ не мог забяспечыць мястэчкам цвёрдую аўтаномію, таму даваў ім асобныя гандлёвыя ільготы і прывілеі, каб падтрымаць іх дабрабыт. Магдэбургскае права ў Літве і Беларусі не было скарыстана з-за манаполіі шляхты на зямельную ўласнасць з поўным феадальным імунітэтам [25].

Прывілеі мястэчкам Літвы ў складзе Літоўскай Метрыкі даследаваў Э. Мейлус [26]. Развіццё магдэбургскага права ў асобных гарадах Літвы разглядаў З. Кяўпа [27 – 30]. Вельмі каштоўнай з’яўляецца яго праца па даследаванню Віленскіх вількераў, палажэнні якіх ужываліся і беларускімі гарадамі [28]. Гэтыя даследаванні ствараюць магчымасць для параўнання самакіравання беларускіх гарадоў з літоўскімі.

**Заключэнне.** Можна сцвярджаць, што ў міжваенны перыяд тэма гарадскога самакіравання не набыла ў савецкай гістарыяграфіі значнага вывучэння. Прычынай гэтага можа быць недастатковая апублікаванасць і захаванасць крыніц. Пры гэтым апублікаваныя кнігі даследчыкаў дарэвалюцыйнага перыяду і гісторыкаў паслярэвалюцыйнага часу забяспечылі, па-першае, пераемнасць у вывучэнні гарадской тэматыкі, а па-другое, паклалі пачатак навуковаму разгляду працэсаў станаўлення і развіцця гарадскога самакіравання як неад’емнай часткі развіцця феадальнага грамадства.

Працы пасляваеннага перыяду з марксісцкіх пазіцый ацэньвалі прычыны ўсталявання гарадскога самакіравання, аддаючы перавагу сацыяльна-эканамічным. Адной з вядучых праблем, якія разгледжаны гісторыкамі гэтага часу, з’яўлялася сацыяльная барацьба ў гарадах, яе класавы характар, цесная сувязь з нацыянальна-вызваленчым рухам. Пры гэтым былі абвержаны ўяўленні расійскіх дарэвалюцыйных гісторыкаў аб адмоўным характары магдэбургскага права, яго насаджэнні вярхоўнай уладай, падкрэслена спалучэнне нямецкага права з мясцовымі традыцыямі.

ЛІТАРАТУРА

1. Любавский, М.К. Основные моменты истории Белоруссии / М.К. Любавский. – М.: Тип. А.П. Яроцкого, 1918.
2. Пичета, В.И. История белорусского народа / В.И. Пичета. – Минск: Изд. центр БГУ, 2003. – 184 с. (Scriptor universitatis).
3. Дружчыц, В.Д. Войты і іх улада ў беларускіх месцах з магдэбургскім правам / В. Дружчыц; Інбелкульт. – Мінск, 1928. – 58 с.
4. Дружчыц, В.Д. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам у XV – XVII стагоддзях / В.Д. Дружчыц. – Мінск: Друкарня Беларус. акад. навук [192?]. – 31 с.
5. Дружчыц, В. Места Вільня ў першай палове XVI сталецця / В. Дружчыц. – Менск, 1926. – 20 с.
6. Дружчыц, В. Места Менск у канцы XV і пачатку XVI ст. / В. Дружчыц // Працы БДУ. – 1926. – № 12. – С. 1 – 22.
7. Дружчыц, В.Д. Беларускія месты ў гістарыяграфічнай літаратуры / В.Д. Дружчыц // Гіст.-археал. зб. – 1927. – № 1. – С. 251 – 276.
8. Бурдзейка, А. Нарыс сацыяльна-эканамічнага жыцця места Навагрудку ў XVI ст. / А. Бурдзейка // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1927. – № 1.
9. Забела, Т. Места Берасцейскае ў XVI ст. / Т. Забела // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кн. 8: Працы клясы гісторыі. – Менск, 1929. – Т. III. – С. 83 – 109.

10. Сцяпанаў, Ц. Гісторыя места Магілёва да надання яму Магдэбургскага права / Ц. Сцяпанаў // Зап. аддз. гуманіт. навук. Працы класа гісторыі. – Менск, 1928. – Т. 2. – С. 308 – 317.
11. Даўгяла, З. Магілёўскае “Брацтва прасалаў” / З. Даўгяла. – Менск, 1926. – 11 с.
12. Копысский, З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск: «Наука и техника», 1966. – 227 с.
13. Копысский, З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск: «Наука и техника», 1975. – 191 с.
14. Копысский, З.Ю. Магдебургское право в городах Белоруссии (конец XV – первая половина XVII в.) / З.Ю. Копысский // Советское славяноведение. – 1972. – № 5. – С. 26 – 41.
15. Капыскі, З.Ю. З гісторыі грамадска-палітычнага жыцця гарадоў Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст. / З.Ю. Капыскі // Труды Ин-та истории АН БССР. Досоветский период. – 1958. – Вып. 3. – С. 15 – 46.
16. Грицкевич, А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI – XVIII вв. / А.П. Грицкевич; АН БССР, Ин-т истории. – Минск: «Наука и техника», 1975. – 248 с.: 1 л. карт.
17. Грыцкевіч, А.П. Кіраванне прыватнаўладальніцкіх гарадоў Беларусі без магдэбургскага права (XVI – XVIII стст.) / А.П. Грыцкевіч // Весці Акад. навук Беларус. ССР. – Серыя грамадскіх навук. – 1974. – № 4. – С. 49 – 58.
18. Грицкевич, А.П. Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI – XVIII вв.) / А.П. Грыцкевич; науч. ред. В.С. Поссе. – Минск: Наука и техника, 1979. – 152 с.
19. Карпачоў, А.М. Самакіраванне гарадоў Беларусі па “Магдэбургскаму праву” ў другой палове XVII – XVIII ст. / А.М. Карпачоў // Весці Акад. навук Беларус. ССР. Серыя грамадскіх навук. – 1969. – № 2. – С. 56 – 64.
20. Карпачёв, А.М. Феодальные юридики в королевских городах Белоруссии XVII – XVIII веков / А.М. Карпачёв // Советское славяноведение. – 1968. – № 6. – С. 27 – 38.
21. Мелешко, В.И. Могилёв в XVI – первой половине XVII в. / В.И. Мелешко; под ред. З.Ю. Копысского. – Минск: Наука и техника, 1988. – 264 с.
22. Юхо, И.А. Общественно-политический строй и право Белоруссии в XVI веке: автореф. дис. … д-ра юрид. наук: 12.00.01 / И.А. Юхо. – Киев, 1980. – 47 с.
23. Юхо, И.А. Правовое положение населения Белоруссии в XV в. / И.А. Юхо. – Минск: Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. – 141 с., [2].
24. Дворниченко, А.Ю. О предпосылках введения магдэбургского права в городах западнорусских земель в XIV – XV вв. / А.Ю. Дворниченко // Вестн. Ленингр. ун-та. История. Язык. Литература. – Вып. 1. – 1982. – № 2. – С. 105 – 107.
25. Юргинис, Ю.М. Судьба магдебургского права в литовских городах / Ю.М. Юргинис // История СССР. – 1975. – № 4. – С. 145 – 155.
26. Мейлус, Э. Привилеи местечкам Литвы на локацию и торги в ЛМ (вторая половина XVII – 1795 г.) / Э. Мейлус // Литовская Метрика. – Вильнюс, 1988. – С. 24 – 25.
27. Kiaupa, Z. Vaito rinkimas Kauno magistrate (XVI – XVIII a.) / Z. Kiaupa // Lietuvos istorijos metraštis. 1974 metai. – Vilnius, 1976. – P. 13 – 16.
28. Kiaupa, Z. 1551 m. ir 1620 m. Vilneaus vilkerai ir ju taikymas Lietuvos Didziosios Kunigaikstystes miestuose / Z. Kiaupa // Jaunuju istoriku darbai. Miedziaga respublikinei jaunuju istoriku mokslinei konferecijai. 1976 m. spalis, t. 1. – Vilniaus, 1976. – P. 41 – 51.
29. Kiaupa, Z. Vilniaus ir Kauno vaitų teisminės galios raida XV – XVII amžiais / Z. Kiaupa // Lietuvos TSR Mokslų akademijos darbai. A serija, 4(49) t. – Vilnius, 1974. – P. 83 – 89.
30. Kiaupa, Z. Vaito rinkimas Kauno magistrate (XVI – XVIIIa.) / Z. Kiaupa // Lietuvos istorijos metraštis, 1974 metai, Vilniaus. – P. 13 – 18.

*Паступіў 04.07.2011*

## SOVIET HISTORIOGRAPHY OF TOWN SELF-GOVERNING OF BELARUS AT THE END OF XIV – XVIII CENTURIES

***S. STRENKOUSKI***

*The author in his article analyzes the views of Soviet historians of interwar and after-war periods, including pre-revolutionary ones, which continued the research in Soviet times, and Lithuanian historians on the problems of towns' self-governing. Continuity of the researched theme should be noted, because the works of scientists of pre-revolutionary period initiated the working out of the question in Soviet times. The estimation of towns' development during this period were made from the Marxist positions that led to insufficient attention to the problems of self-governing. Herewith the merit of Soviet historians composes the refusal of negative estimation of Magdeburg rights in the history of towns of Grand Duchy of Lithuania.*